**УДК 32.001+340(476)**

# САЦЫЯЛЬНАЯ ЎТОПІЯ Ў ГІСТОРЫІ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

***канд. гіст. навук, дац. І.У. ВІШНЕЎСКАЯ***
***(Мінскі інавацыйны ўніверсітэт)***

*Аналізуюцца ўтапічныя праекты, вядомыя ў гісторыі палітыка-прававой думкі Беларусі. Звяртаецца ўвага на тое, што ўтапічныя ідэі нашых суайчыннікаў былі інтэграваны ў тэарытычныя пошукі еўрапейскіх мысліцелей-утапістаў, але з абавязковым улікам гістарычных, геапалітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых асаблівасцей жыцця беларускага народа.*

***Ключавыя словы:*** *сацыяльная ўтопія, рэнесансавая Беларусь, асвета, сацыяльна-палітычны лад, дзяржава, права.*

Вывучэнне спецыяльнай літаратуры дае падставу разглядаць утапічную думку як адзін з напрамкаў маральнага і палітычнага мыслення, які існаваў, існуе і будзе існаваць пакуль існуе чалавечае грамадства. У падмурку ўсіх сацыяльных утопій, як старажытных, так і сучасных, ляжыць незадавальненне існуючым сацыяльна-палітычным ладам, імкненне да больш дасканалага ўладкавання грамадства і дзяржавы. Утапічныя праекты адлюстроўвалі ўяўленне іх аўтараў аб ідэальных дзяржаўна-прававых канструкцыях. Яны, па сутнасці, былі выклікам існуючым палітычным і прававым інстытутам, індывідуальнымі праектамі вырашэння сацыяльна-палітычных і прававых праблем.

Аналіз розных утапічных канцэпцый дазваляе выдзеліць наступныя абагульняючыя рысы, характэрныя для любой з іх:

- *па-першае,* утопіі звяртаюцца не да існуючай рэчаіснасці, а да будучыні. Утапічныя грамадствы ізаляваны не толькі ў часе, але і ў прасторы і носяць фантастычны характар;
- *па-другое,* у канструкцыі ўсіх утопій існуе стан усеагульнай згоды, пабудаванай часцей за ўсе на грамадскім дагаворы;
- *па-трэцяе,* утапічныя грамадствы не ведаюць сацыяльных канфліктаў, у іх пануе мір і сацыяльная гармонія.

Сацыяльна-ўтапічныя праекты вядомы гісторыі ўсіх цывілізаваных народаў, у тым ліку і беларускаму. У розныя перыяды гісторыі ў палітыка-прававой думцы Беларусі з’яўляліся сацыяльна-ўтапічныя ідэі, якія адлюстроўвалі як агульныя для ўсіх утапічных канструкцый рысы, так і спецыфічныя асаблівасці, сфарміраваныя пад уплывам нацыянальнай палітыка-прававой традыцыі.

Тыповы ўтапічны праект быў прапанаваны мысліцелямі рэнесансавай Беларусі, якія адносіліся да радыкальнага крыла антытрынітарыяў (адзін з напрамкаў пратэстантызму, прадстаўнікі якога адмаўлялі шматлікія хрысціянскія дагматы, у тым ліку троіцу – *І. В.*). У навуковай літаратуры названае крыло антытрынітарыяў выступае пад назвай радыкальныя гуманісты ці радыкальныя анархісты.

Сацыяльны ідэал радыкальных гуманістаў быў выкладзены ў працах П. Гезкі “Аб першахрысціянскай царкве”, “Пра сына божага” і іншых, а таксама ў творы М. Чаховіца “Хрысціянскія размовы”.

Крытыкуючы феадальны лад грамадства і манархічную форму кіравання з яе прававой сістэмай, яны прапанавалі сваім прыхільнікам абвясціць байкот органам дзяржаўнай улады, ігнараваць судовыя ўстановы і іншыя прававыя інстытуты, адмаўляцца ад удзелу ў ваенных кампаніях нават тады, калі яны былі накіраваны на абарону айчыны. Дзеля рэалізацыі ідэй роўнасці людзей (П. Гезка нагадваў біблейскую ісціну аб тым, што ўсе людзі браты і пытаў, як жа тады брат можа панаваць над братам?) радыкальныя арыяне заклікалі падзяліць маемасць, якая належыла багатым, знішчыць усе дзяржаўныя ўстановы, суд, войска. Сваю нецярпімасць радыкалы пераносілі і на культурныя каштоўнасці, створаныя ў класавым грамадстве. Па іх разуменню, набыткі культуры падмацоўвалі ўладу, асвячалі шкодныя для простага чалавека ідэалы.

Які ж праект сацыяльнага ўладкавання прапаноўвалі радыкальныя арыяне замест існуючага феадальна-манархічнага грамадства?

Улічываючы тое, што ўсе палітыка-прававыя інстытуты заўсёды стаяць на ахове інтарэсаў кіруючай эліты і варожыя простаму чалавеку, ідэал сацыяльнай супольнасці яны шукалі не ў сусветнай і не ў айчыннай гісторыі, а ў вопыце арганізацыі жыцця першахрысціянскіх абшчын, пабудаваннага ў адпаведнасці з прынцыпамі сацыяльнай і маёмаснай роўнасці людзей. Стварэнне грамадства ўсеагуль-

най роўнасці і справядлівасці радыкальныя анархісты звязвалі з прышэсцем Хрыста, якое павінна стаць канцом свету насілля і несправядлівасці і пачаткам царства боскага. Ідэйным падмуркам новага грамадства радыкальныя гуманісты бачылі Біблію і здаровы розум простага чалавека.

Безумоўна, вострая крытыка левымі антытрынітарыямі сацыяльных хвароб феадальнага грамадтва мела пазітыўнае значэнне, але разам з тым стварала небяспеку для дзяржавы ў час суровых выпрабаваняў другой паловы XVI стагоддзя. Недапушчальнымі лічылі славутыя сучаснікі радыкальных гуманістаў, С. Будны, В. Цяпінскі, А. Волан і іншыя заклікі да байкоту ўсіх дзяржаўных устаноў, зрыву мабілізацыі ў паспалітае рушэнне (шляхецкае апалчэнне). Напрыклад, А. Волан падкрэсліваў, што ўрад, суд, войска скасавання якіх патрабавалі радыкалы, неабходны дзеля забеспячэння дзейнасці права і абароны справядлівасці [1, с. 59].

На аснове рэлігійнага рацыяналізму антытрынітарыяў пазней пачала фарміравацца айчынная атэістычная думка, яскравым прадстаўніком якой быў Казімір Лышчынскі. З імем апошняга звязаны ўтапічныя ідэі, запазычаныя з праектаў вядомых еўрапейскіх мысліцелей XVI–XVII стагоддзяў.

Атрымаўшы бліскучую на той час адукацыю, педагог, грамадска-палітычны дзеяч, паважаны ў шляхецкім грамадстве Рэчы Паспалітай чалавек, які неаднаразова абіраўся брэсцкай шляхтай паслом на агульнадзяржаўныя соймы, суддзей у Літоўскі трыбунал, падсудкам у земскі шляхецкі суд, К. Лышчынскі, па праву лічыцца адным з прадвеснікаў асветніцкай ідэалогіі ў Беларусі. Абвінавачаны ў атэізме, ён скончыў свае жыцце на кастры інквізіцыі.

Радыкалізм атэістычных поглядаў К. Лышчынскага абумоўліваў радыкалізм і сацыяльна-палітычны. Ен лічыў неабходным пабудову грамадскага ладу на больш справядлівых асновах: “свет без улады, гарады без начальнікаў, народы без гаспадара, храмы без святароў, капітолій без суддзяў” [2, с. 266]. У вылучаных Лышчынскаму пад час суда абвінавачваннях значылася прыхільнасць мысліцеля да ўтапічных праектаў Т. Мора, Т. Кампанелы і асабліва іспанца Антоніо дэ Гевары, выкладзенага ў рэнісансавым утапічным рамане “Настаўленні хрысціянскага манарха”. Такім чынам, сацыяльная ўтопія К. Лышчынскага фарміравалася ў рэчышчы еўрапеўскіх і айчанных гуманістычных традыцый і ўвабрала ў сябе ідэалы сацыяльнай, палітычнай, прававой, маемаснай роўнасці і справядлівасці.

У другой палове XVIII стагоддзя ў грамадска-палітычнай думцы Рэчы Паспалітай з’яўляецца шэраг праектаў рэфармавання сацыяльна-эканамічных, палітычных і прававых інстытутаў, якія фарміраваліся ў рэчышчы агульнаеўрапейскай асветніцкай ідэалогіі. Разам з тым у іх знайшлі адлюстраванне канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні феадальнага грамадства, паляпшэнні ўмоў жыцця сялян, якія прызнаваліся асноўнымі вытворцамі матэрыяльных даброт дзяржавы. Падобныя ідэі неаднаразова абмяркоўваліся ў працах мысліцелей-асветнікаў Рэчы Паспалітай, але, на жаль, не знаходзілі ўвасаблення ў афіцыйных дакументах і сацыяльна-эканамічных рэформах.

Няздольнасць палітычнай эліты ўзяць на сябе адказнасць за рашучыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя рэформы ў краіне і з іх дапамогай пераадолець крызіснае становішча Рэчы Паспалітай падштурхнула да спробы ўтварэння ідэальных сацыяльна-палітычных грамад на лакальным узроўні – тэрыторыі пэўнага прыватнага ўладання. Прыкладам з’яўляецца вопыт Паўлаўскай рэспублікі, дзе на фоне агульнага сацыяльна-палітычнага крызісу дзяржавы была рэалізавана мадэль справядлівага грамадства. Аб гісторыі Паўлаўскай рэспублікі, якая праіснавала амаль тры дзесяцігоддзі, апавядае ананімны аўтар твора “Паўлава ад 1767 да 1795, адным хатнім прыяцелем апісанае”, які быў выдадзены ў Варшаве ў 1811 годзе. У творы распавядаецца гісторыя стварэння і дзейнасці “Паўлаўскай рэспублікі”.

Заснавальнікам рэспублікі быў грамадскі і дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, прадстаўнік старажытнага шляхецгага рода Павел Бжастоўскі. Аграрныя рэформы, распачатыя ім у сваім маентку Мерач Віленскага павета, мелі працяг у іншых, больш шырокіх пераўтварэннях. У прыватнасці, ён скасаваў прыгоннае права ва ўсіх сваіх уладаннях, дараваў сялянам асабістую волю і перадаў абшчыне кіраванне ўласнасцю. Мерач быў абвешчаны рэспублікай, якая мела ўсе атрыбуты дзяржавы: заканадаўчы орган (сойм), прэзідэнта, міністэрства фінансаў, скарб, грошы, войска, сцяг, герб, канстытуцыю. Пасада прэзідэнта сялянамі маёнтка была прапанавана самаму Бжастоўскаму. У яго гонар Мерач і была пераіменавана ў Паўлаўскую рэспубліку [3, с. 59]. Сацыяльна-эканамічныя рэформы, праведзеныя на абмежаванай тэрыторыі ахопленай крызісам дзяржавы, Павел Бжастоўскі апісаў у кнігах “Уставы для добрага парадку і павіннасцей аселых людзей у маентку Паўлава, ці Мерач, прадпісаныя ў 1771 г.” і “Лісты ананіма, якія апісваюць камісію вольных паўлаўскіх валашчан са сваім дзедзічам, ксянзом Бжастоўскім, экс-рэферэндарам ВКЛ” [4, с. 326].

Пошукі сацыяльнага ідэала характарызуюць і дзейнасць нашага суайчынніка Іосіфа Яленскага, публіцыста і рэвалюцыянера, аўтара твора “Благавесць да Ісраіля Расійскага”.

Сацыяльным ідэалам Яленскага было пэўнае аб’яднанне людзей на падставе агульнанароднай уласнасці на сродкі вытворчасці, абавязковай працы ўсіх працаздольных, фарміравання органаў кіравання шляхам усеагульных выбараў, адмаўленне ад асноўных хрысціянскіх канфесій (каталіцкай, праваслаўнай) па прыкладу раннехрысціянскай царквы. У грамадстве “благавесці”, як яго вызначаў мысліцель, расквітнее ўсеагульнае шчасце. Усе грамадзяне будуць мецъ магчымасць атрымаць адукацыю і заняць годнае месца ў грамадстве, дзеці, інваліды і старыя людзі будуць утрымлівацца за кошт абшчыны. На кіруючыя пасады і суддзямі, на думку Яленскага, будуць абірацца мудрыя, сумленныя асобы, якія карыстаюцца павагай у грамадстве, а законы, якія рэгулююць грамадскае жыцце, будуць нешматлікімі, простымі, яснымі, зразумелымі. Разам з тым асноўным рэгулятарам грамадскага жыцця павінны стаць нормы маралі. Яленскі быў упэўнены ў неабходнасці адмаўлення ад смяротнага пакарання. На яго думку, меры маральнага асуджэння і, як крайняя мера, выгнанне з абшчыны, павінны стрымліваць сяброў абшчыны ад парушэння агульнапрызнаных правілаў. Есць падставы сцвярджаць, што сацыяльная ўтопія Яленскага спалучалася з асветніцка-дэмакратычнымі ідэаламі XVIII стагоддзя – сацыяльны кампраміс, усеагульная адукацыя, дабрабыт народа, яго духоўнае ўдасканаленне [5, с. 106].

У пачатку XX стагоддзя ў еўрапейскай філасофскай традыцыі назіраецца імкненне да пераасэнсавання старых каштоўнасцей і ідэалаў, пошуку новых форм грамадскага жыцця, якія б адпавядалі пэўнаму культурна-гістарычнаму тыпу народа, яго ідэнтычнасці. Найбольш выразна ў палітыка-прававой думцы Беларусі гэтыя ідэі праявіліся ў творчасці Ігната Уладзіміравіча Абдзіраловіча (Канчэўскага). У сваім асноўным, вызначальным творы, філасоўскім эсэ “Адвечным шляхам”, Абдзіраловіч ставіць праблему пошука Беларуссю напрамкаў уласнага развіцця, адпавядаючых самабытнасці, адметнасці, ідэнтычнасці народа.

Філосаф адзначае, што асаблівасцю гістарычнага жыцця беларусаў было ваганне паміж дзвума накірункамі еўрапейскай цывілізацыі, маючымі моцныя месіянскія пачаткі – польскім каталіцкім і расійскім праваслаўным. Гэта ваганне паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыхільнасць ні да аднаго і ні да другога з’яўляюцца асноўнай адзнакай гісторыі беларускага народа [6, с. 9]. Абдзіраловіч быў шчыра ўпэўнены што “беларускае жыцце” не ўпісваецца ні ў польскі, ні ў расійскі цівілізацыйны тып. Таму ён прапануе знайсці такую форму сацыяльнага аб’яднання, якая б не стрымлівала творчае развіцце народа, а заўседы адпавядала “жыццевым праявам”, адмаўляла дэгуманізаваныя ідэі і прынцыпы пабудовы грамадства. Звяртаючыся да гістарычнага вопыту сацыяльных аб’яднаняў, Абдзіраловіч прыводзіць у якасці прыклада такога аб’яднанне, як Запарожская Сеч, галоўнай прыкметай якой была адсутнасць прымусу да сваіх сяброў: “Сеча з аружжам у руках бараніла чалавечае права на волю і незалежнасць” [6, с. 40].

Цікава, што ўжо ў 1921 годзе на пачатку станаўлення савецкай сацыялістычнай дзяржавы, аўтар “Адвечнага шляху” не бачыў перспектыў пабудовы ў ёй агульначалавечага справядлівага грамадства. На яго думку, марксізм падмяніў ідэяй класавай перамогі святую справу вызвалення чалавецтва. Знішчаны сілай рэвалюцыі, існуючы парадак вядзе да вызвалення разбуральнай энергіі мас, у выніку чаго з’яўляецца новы дзяржаўны арганізм, які стварае для народа яшчэ горшыя кайданы, турмы і мукі. Таму на змену старым дзяржаўным формам павінны прыйсці новыя. Прыкладам непрымусовай арганізацыі, на думку Абдзіраловіча, з’яўляецца кааперацыя. У ей аўтар бачыў адзінае грамадскае аб’яднанне, якое не дапускае прымусу ні ў адносінах да сваіх сяброў, ні ў адносінах да іншых грамадзян.

У 1922 годзе ў артыкуле “Кааперацыя” І. Абдзіраловіч абгрунтаваў канцэпцыю самабытнага шляху сацыяльнага развіцця для Беларусі. Гэта шлях сялянска-рамесніцкіх вольных брацтваў і народнай кааперацыі. Галоўнай умовай сацыяльнай творчасці, якая есць асноўны рухавік жыцця грамадства, І. Абдзіраловіч лічыў адсутнасць прымусу, незалежнасць асобы, народа, нацыі. Свабода, марыў філосаф, павінна пранізваць увесь быт грамадства, палітычны, эканамічны, маральны бакі жыцця, распрыгоніць, вызваліць да творчага развіцця ўнутраны патэнцыял як асобы, так і грамадства ў цэлым [6, с. 42].

Улічваючы тое, што І.У. Абдзіраловіч у аснову сваіх сацыяльных ідэй паклаў адмаўленне ад устойлівых, звыклых на працягу стагоддзяў форм грамадскага жыцця, яго погляды могуць быць прызнаны ўтапічнымі. Звяртае на сябе ўвагу тое, што крытыкуючы існуючыя формы сацыяльна-палітычнага жыцця (прыватную ўласнасть як падставу сацыяльна-класавага падзелу грамадства; саму дзяржаву і царкву, якія ахоўваюць інтарэсы вярхоў), сацыялісты-ўтапісты шукалі грамадскі ідэал, які будзе заснаваны на ідэі калектывізму, маёмаснай роўнасці, справядлівасці, законнасці, сацыяльнага кампрамісу.

Падсумоўваючы, адзначым, што некаторыя ідэі мысліцелей мінулага, якія ў свой час бачыліся нездзяйсняльнымі, былі рэалізаваны ў сучасных прававых сацыяльных дэмакратычных дзяржавах. Разам з тым трэба пагадзіцца з думкай некаторых даследчыкаў, што ў аўтараў утапічных трактатаў амаль адсутнічаюць патрабаванні абароны індывідуальных правоў і свабод асобы, гарантый іх з боку дзяржавы [7, с. 188].

Такім чынам, палітычная і прававая думка Беларусі ў розныя перыяды яе гісторыі была шчыльна інтэгравана ў кантэкст еўрапейскага жыцця. У ей знаходзім адбіткі ідэй і тэарытычных пошукаў еўрапейскіх мысліцелей, у тым ліку ўтапічных праектаў, але абавязкова з улікам гістарычных, геапалітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых асаблівасцей жыцця беларускага народа.

ЛІТАРАТУРА

1. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі : Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.
2. Пракошына, К.С. Казімір Лышчынскі / К.С. Пракошына // Асветнікі зямлі беларускай X – пач. XX ст. : энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн, 2001. – 496 с.
3. Асветнікі зямлі беларускай : энцыкл. даведнік / рэдкал. Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – 496 с.
4. Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 3 т. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. – 688 с.
5. Вішнеўская, І.У. Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.) / І.У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2008. – 296 с.
6. Абдзіраловіч, І.У. Адвечным шляхам. Даследзены беларускага светапогляду / І.У. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 43 с.
7. История политических и правовых, учений : учебник для вузов / под общ. ред. В.С. Нерсесянца. – 2-е изд. – М. : Норма-Инфра,1999. – 736 с.

*Паступіў 26.03.2018*

**SOCIAL UTOPIA IN THE HISTORY OF POLITICAL AND LEGAL THOUGHT IN BELARUS**

***I. VISHNEVSKAYA***

*The article analyzes control projects, known in the history of political and legal thought of Belarus. Attention is drawn that under control the ideas of our compatriots have been integrated in theoretical studies of European thinkers, utopians, but with the obligatory account the historical, geopolitical, socio-economic and other peculiarities of life of the Belarusian people.*

***Keywords:*** *social utopia, renaissance Belarus, education, socio-political system, the state law.*